# МЕНТАЛЬНЫЯ АСНОВЫ СТАХАНАЎСКАГА ЭНТУЗІЯЗМУ СЯРЭДЗІНЫ 1930-Х ГАДОЎ (НА МАТЭРЫЯЛАХ БЕЛАРУСІ)

**А. А. Субоцін**

*Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П. М. Машэрава, Беларусь*

Сярод сучасных гісторыкаў Беларусі, Расіі і Украіны ўзнікла новая тэндэнцыя даследавання гістарычных працэсаў, якая аформілася ў выглядзе такіх накірункаў, як гісторыя ментальнасцяў, гісторыя штодзённасці, новая сацыяльная гісторыя і іншых. Сутнасць гэтых накірункаў звязана з выяўленнем асаблівасцяў духоўнага свету чалавека пэўнай эпохі, стэрыатыпаў яго паводзін, каштоўнасных арыентацый. Адным з ключавых элементаў у такога рода даследаваннях выступае паняцце «менталітэт» ці «ментальнасць». Яно ўяўляе сабой сукупнасць сацыяльна-псіхалагічных установак, аўтаматызмаў і звычак свядомасці, якія фармуюць спосабы бачання свету і ўяўленні людзей, што належаць да той ці іншай сацыякультурнай супольнасці [1]. Стаханаўскі рух як адна з масавых з'яў савецкага грамадства 1930-х гг. меў у сваім развіцці акрамя пэўных сацыяльна-эканамічных і палітычных фактараў уплыў менталітэту.

Мэтай дадзенага даследавання з'яўляецца выяўленне ментальных асноў развіцця стаханаўскага руху ў сярэдзіне 1930-х гг. на матэрыялах Беларусі.

Менталітэт у якасці фіксавання асаблівасцяў стану таго ці іншага грамадства ўбірае ў сябе як павольна зменлівая з'ява феномену чалавека сацыякультурную характарыстыку папярэдніх эпох і перыядаў развіцця соцыуму. Матывы працоўнай дзейнасці стаханаўцаў шмат у чым прадвызначаліся рысамі менталітэту традыцыйнага грамадства: на разгортванне руху паўплывала міфалагічнасць традыцыйнага светаўспрымання, якое ўвасобілася ў новых вобразах герояў вытворчасці. Гэта міфалагічнасць паказвае на тое, што звычайныя рэальныя факты перавыканання плана Стаханавым і іншымі стаханаўцамі набывалі форму легендарнасці, станавіліся прыкладамі для пераймання. Напрыклад, калгасніцы-тысячніцы Дрысенскага раёна ў сваіх прыпеўках атаясамлівалі сваю працу з дзейнасцю знакамітай Марыі Дземчанка:

Каля лесу над гарою
Працякае рэчанька,
Будзем мы работаць так,
Як Марыя Дземчанка [2, арк. 403].

Самай складанай і супярэчлівай рысай менталітэту традыцыйнага грамадства, якая была закладзена ў аснове стаханаўскага энтузіязму, можна лічыць успрыманне цудаў і Бога. Ва ўмовах секулярызацыі ў савецкім грамадстве, калі ішла замена хрысціянскіх каштоўнасцей каштоўнасцямі сацыялістычнай маралі, ранейшыя элементы карціны свету традыцыйнага грамадства набывалі іншыя формы. Калі ў хрысціянстве цуды ўспрымаліся як боскае ўмешванне ў зямныя справы насуперак прыроднаму парадку, то ў савецкім грамадстве гэтае ўспрыманне цудаў набывае іншае значэнне – не Бог – крыніца цудаў, а сам чалавек, які насуперак умовам зямнога жыцця зможа тварыць цуды. Людзьмі, здольнымі на цуды ў масавай свядомасці чалавека 1930-х гг., і становяцца стаханаўцы. Як адзначаў адзін з супрацоўнікаў Талачынскага аддзела НКУС у сваёй прамове на сходзе партарганізацыі: «Лозунг товарища Сталина оседлать технику и погнать её вперёд подхватили трудящейся Союза, и первые стахановцы оправдают мечты Маркса–Энгельса о чудесной жизни» [3, арк. 39].

Матывы ўключэння рабочых і сялян у стаханаўскі рух караніліся таксама і ў рэвалюцыйнасці калектыўнай свядомасці пачатку XX ст. Гэта рэвалюцыйнасць знайшла сваё далейшае развіццё ў сітуацыі сацыяльных крызісаў Першай сусветнай вайны, падзей 1917 г., а таксама ў гады грамадзянскай вайны. У новых умовах індустрыялізацыі канца 1920–1930-х гг. яна паўстала ў форме актывізацыі грамадскай і

працоўнай дзейнасці, у тым ліку і ў форме стаханаўскага руху. Адбывалася трансфармацыя рэвалюцыйных ментальных рыс у энтузіязм савецкага перыяду. Дадзеную заканамернасць можна прасачыць на прыкладзе Чашніцкай папяровай фабрыкі «Чырвоная зорка», дзе актыўнымі стаханаўцамі былі рабочыя, што прымалі ўдзел у грамадзянскай вайне ў Чырвонай Арміі [4, арк. 7–8]. У сацыяльных паводзінах стаханаўцаў, такім чынам, захаваліся ранейшыя ментальныя ўстаноўкі на карэнныя, рэвалюцыйныя змены.

У інтэнсіўнай ломцы старых вытворчых нормаў заключаўся стымул рэвалюцыйнай перабудовы эканомікі, пад якім разумелася і ломка ўсяго старога, што існавала ў грамадстве. Комплексы рэвалюцыйнай, узброенай барацьбы з канчатковай мэтай перамогі над старым светам выяўляліся ў стаханаўцаў у працы, а ў прыватнасці ў высокіх яе паказчыках. Так, на металаапрацоўчым заводзе імя Кірава (Віцебск) ініцыятары стаханаўскага руху Лін, Латышэўскі, Бірукоў выконвалі план на 300–400 % [5, арк. 46].

Акрамя таго, і само партыйнае кіраўніцтва часта ўпамінала на афіцыйным узроўні пра рэвалюцыйнасць, тым больш яна магла стаць важным сродкам у разгортванні фарсіраваных тэмпаў індустрыяльнага будаўніцтва. Сам Сталін на I Усесаюзнай нарадзе стаханаўцаў адзначаў: «Ён (стаханаўскі рух) прызваны выклікаць у нашай прамысловасці рэвалюцыю» [6, с. 363], а пералічаных вышэй герояў працы з завода імя Кірава ў мясцовых партыйных органах называлі «сапраўднымі рэвалюцыянерамі сацыялістычнай прамысловасці» [5, арк. 46]. Пад уздзеяннем ідэй, што дэкларавaліся «зверху», рысы рэвалюцыйнасці ўзмацняліся, станавіліся дамінантнымі ў ментальным складзе рабочых і сялян, што і прадвызначыла шырокае ўключэнне ў стаханаўскі рух працоўных мас.

Пры гэтым значную частку стаханаўцаў складалі людзі, у паводзінах якіх ужо замацаваліся савецкія формы рэвалюцыйнасці ў выглядзе матываў удасканалення працы і павышэння яе прадукцыйнасці, што знайшло адлюстраванне ва ўдзеле яшчэ ў гады першай пяцігодкі ў руху ўдарнікаў. На Віцебскім панчоткамбінаце да свайго ўключэння ў стаханаўскі рух ударнікамі былі рабочыя: Годеман Х. (ударніца з 1931 г.), Захараў М. (з 1931 г.), Самерсава Л. (з 1931 г.), Эцінген З. (з 1932 г.) і ншыя [7, арк. 4–29]. Падобныя тэндэнцыі можна было назіраць і на іншых прадпрыемствах БССР.

Праведзеныя намі на матэрыялах Беларусі даследаванні паказалі, што стаханаўскі энтузіязм сярэдзіны 1930-х гг. меў пад сабой ментальныя асновы як традыцыйнага гарамадства, якія выявіліся ва ўзнікненні новых міфалагізаваных вобразаў герояў вытворчасці – стаханаўцаў, трансфармаваным разуменні хрысціянскіх цудаў у выглядзе ўсталявання стаханаўскіх рэкордаў, так і рысы радыкальных імкненняў мас пачатку XX ст. на пераўтварэнне сацыяльнай рэчаіснасці, што ва ўмовах фарсіраванай індустрыялізацыі праявіліся ў выглядзе рэвалюцыйнай ломкі старых метадаў вядзення працы.

ЛІТАРАТУРА

1. Пушкарев, Л. Ментальности (менталитет) / Л. Пушкарев, Н. Пушкарева // Энциклопедия-рол. Рэжым доступу : http://www.krugosvet.ru.
2. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (далей ДАВВ). Ф. 10061. Воп. 2. Спр. 75.
3. ДАВВ. Ф. 85. Воп. 2а.Спр. 25.
4. ДАВВ. Ф.105. Воп. 2а. Спр. 138.
5. ДАВВ. Ф. 102. Воп.1. Спр. 365.
6. Первое Всесоюзное совещание рабочих и работниц-стахановцев. 14–17 ноября 1935 г. Стенограф. отчет. – Москва, 1935.
7. ДАВВ. Ф. 96. Воп.1. Спр. 122.